*Юрый Барадзін*

**ДАЖБОГАВЫ ЎНУКІ**
***(этнічная самасвядовасць русічаў у язычніцкай марфалогіі і рыцарскім эпасе)***

Дажбог (або Даждзьбог) — у славянскай міфалогіі бог сонечнага святла, сын Сварога. Яго імя чуецца ў самай кароткай, дажыўшай да нашых дзён, малітве: «Дай, Божа!». Старажытныя славяне лічылі Сонца, Маланку і Агонь – два нябесных полымя і адно зямное – роднымі братамі, сынамі Неба і Зямлі. Нашы продкі верылі, што Дажбог апякуецца вяселлямі, сустракае жаніха на світанні ў дзень шлюбу. Дажбог замыкае зіму і адмыкае лета. Верагодна, Дажбог суадносіцца з Апалонам як бог сонечнага святла.

Дажбог быў у славян богам Сонца, сонечнага цяпла, урадлівасці, лета і шчасця. Таксама, вядомы як – Шчодры бог. Сімвал – Сонечны дыск. Дажбог размяшчаецца ў залатым палацы на зямлі вечнага лета. Седзячы на троне з золата і пурпуру, ён не баіцца ценяў, холаду ці няшчасця. Ён - вясёлы бог і страта трона не моцна яго турбуе, пакуль дабро ўзнагароджваецца і зло пакарана. Імя яго не ад слова «дождж», як іншы раз памылкова думаюць, яно азначае — «Бог, які дае». Славяне верылі, штоДажбог ездзіць па небу ў цудоўнай калясніцы, запрэжанай чацвёркай белых вогнегрывых коней з залатымі крыламі. А сонечнае святло зыходзіць ад вогненага шчыта, які Дажбог возіць з сабой.

Любоў да сонца ў славян засведчана шматлікімі паданнямі і помнікамі. Аўтара «Слова пра паход Ігаравы» кажа аб славянах, як аб унуках сонца – Дажбога. Як свяціла вечна чыстае, асляпляльнае ў сваім ззянні, якое абуджае зямное жыццё, сонца лічылася добрым, міласэрным; імя яго зрабілася сінонімам шчасця. Сонца – заступнік усіх бедных сіротаў. Разам з тым сонца карае нячыстую сілу і маральнае зло – няпраўду і бязбожнасць.



*Малюнак 1* – Выява Дажджбога, XXI ст.



Малюнак 2 – Выява Дажджбога паводле ўяўленняў мастака Віктара Крыжаніўскага

Дажбог вельмі падобны на прыгожага маладога князя са срэбнай барадой і залатымі вусамі. Каля яго – сноп жыта, у адной руцэ – сонечная птушка, у другой – яблык. Часта паўстае на белым кані. На працягу дня ён паступова старэе, але кожную раніцу зноў амалоджваецца. Дажбог ляціць па небе ў аздобленай дыяментамі залатой калясніцы, у якую запрэжаны белыя коні з залатымі грывамі, якія дыхаюць агнём. Дажбог у шлюбе з Месяцам. Месяц з'яўляецца ў пачатку лета і пакідае Дажбога зімой. Кажуць, што землятрус – знак дрэннага настрою пары.

Нашы продкі лічылі сябе не рабамі багоў, а ўнукамі Дажбога. Верылі, што Дажбог дае людзям фізічную сілу, здароўе, майстэрства. Ёнпадарыўчалавекунесмяротную душу, падказваўёй шлях па бясконцым коле ператварэнняў. Дажбог – крыніцадабрабыту, багацця, чалавечнасці.

Аб Дажбогу – Сонцы – казалі як аб першым кіраўніку, заснавальніку каляндарнага рахунку дзён, заканадаўцы. Дажбог адлюстроўваўся на калясніцы, у якую запрэжаны грыфоны – сабакі з птушынымі крыламі, спадарожнікі багоў урадлівасці, у руках бога – рытуальныя посахі з выявай лісця папараці.

Дажбогу прыслугоўваюць чатыры дзяўчыны выключнай прыгажосці. Зара Ранішняя адкрывае вароты палаца раніцай. Зара Вячэрняя закрывае іх вечарам. Вячэрняя Зорка і Зорка Дзянніца, Ранішняя Зорка, пільнуюць цудоўных коней Дажбога.

Дажбог захоўвае зямныя ключы. Ён замыкае на зіму зямлю, а потым аддае ключы птушкам, якія адносяць іх у Вырай. Вясной птушкі вяртаюць ключы, і Дажбог адмыкае імі зямлю. Прадвесніцаю Дажбога з'яўляецца Багіня святла – Дзянніца.

У славянаў ёсць такое паданне: калі Сонца гатова выйсці з сваіх хмараў, каб здзейсніць дзённае падарожжа па белым свеце, то нячыстая сіла збіраецца і чакае моманту яго з'яўлення, спадзеючыся захапіць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бажаство дня і забіць яго. Але пры адным набліжэнні Сонца нячыстая сіла разбягаецца, адчуваючы сваё бяссілле. Кожны дзень паўтараецца барацьба і кожны раз перамагае Сонца.

Па агульным германскім і славянскім павер'і збіраць лекавыя травы, чэрпаць лячэбную ваду і прамаўляць закляцці супраць чар і хвароб лепш за ўсё на ўзыходзе яснага сонца, бо з першымі сонечнымі прамянямі знішчаецца ўплыў злых духаў і разбураецца ўсякае вядзьмарства; вядома , што крык пеўнятаксама прадказвае раніцу, так страшны нячыстай сіле, што яна адразу знікае, як толькі яго слыша.

Дзень Дажбога - нядзеля, яго метал - золата, яго камень - яхонт. Дажбог - Даб, Радэгаст, Радыгош, Сварожыч - гэта розныя варыяцыі імя аднаго і таго ж бога. Бог урадлівасці і сонечнага святла, жыватворнай сілы.Іншымі словамі, гэтыя імёны, магчыма, абазначаюць: "госць які даруе сонца і сонечнае святло", або пасланнік багоў, які прынёс сілу святла і сонца ў дар. У гэтым выпадку ўсходнеславянскі Дажбог і заходнеславянскі Радэгаст - розныя імёны аднаго і таго ж бога - Сварожыча.

Свяшчэннай жывёлай Дажбога лічыўся леў (як і ў персідскага бога Сонца – Мітры), Сварожыча малявалі альбо з ільвінай галавой, альбо на калясніцы, запрэжанай львамі. Сімваламі Сварожыча з'яўляюцца не толькі царскія львы, але і вепрукі (вяпрук - таксама ўвасабленне індыйскага Вішны і скандынаўскага Фрэйра).

Даждбога называлі Спасам, г.зн. Выратавальнікам ў сэнсе абаронцы. Таму, яблычны (19 жніўня) і мядовы Спас (14 жніўня) - гэта дні ўшанавання Сварожыча. Яго шануюць і на Юр’еў дзень (9 снежня).

Беларускі паэт і спявак Анатоль Кудласевіч прысвяціў частку сваіх радкоў Дажбогавым унукам:

“Хай адкрыюцца вочы
Паглядзець, што мы хочам —
А мы хочам лічыцца людзьмі.
Мы — Дажбогавы ўнукі —
Нам не жыць пад прынукай —
Дай свабоду, а жыцці — вазьмі” [3].

«Дажбогавы ўнукі» - такія словы выкарыстаў аўтар «Слова пра паход Ігаравы» у дачыненні да русічаў для вылучэння іх роднаснай супольнасці і аб’яднання перад пагрозай знешніх ворагаў:«Тогда при Олзе Гориславличи сеяшется и растяшеть усобицами, погибашеть жизнь Даждьбожа внука, в княжих крамолах веци человекомь скратишась».«Въстала обида в силах Даждьбожа внука, вступила девою на землю Трояню, въсплескала лебедиными крылы на синем море у Дону: плещучи, упуди жирня времена» [2].

Многія даследчыкі разглядаюць два ўрыўка аб Дажбогу, з «Слова аб палку Ігаравым» і летапісу, як частку аднаго міфа аб паходжанні княжацкай улады. Дажбог быў першым царом славян, а князі, у тым ліку і рускія, - гэта нашчадкі ўнукі») Дажбога.

**Спіс літаратуры:**

1. Беларуская міфалогія : дапам. / уклад. У. А. Васілевіч. – Мн.: Універсітэцкае, 2001. – 208 с.
2. Лихачёв, Д. С. «Слово о полку Игореве»: Ист.-лит. Очерк : пособие для учителей. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Просвещение, 1982. – 176 с. : ил.
3. Кудласевіч, А. А. «Трыццаць тры крокі да Годнасці» / А. А. Кудласевіч. – Мінск : Маст. літ., 2013.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ